# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВА

УДК [7.096+7.097]:785.1(476)

*У. А. Трапянок*

## Дзейнасць сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі: гісторыя і сучаснасць

*Артыкул прысвечаны даследаванню гістарычных і сучасных кірункаў дзейнасці сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі. Аўтар удакладняе дату з'яўлення калектыву, выяўляе асаблівасці працы, яго запатрабаванасць ў эфіры і музычным жыцці краіны ў XX ст.*

*Аналізуючы працу аркестра ў XXI ст., аўтар у храналагічнай паслядоўнасці падае інфармацыю пра дырыжораў, даследуе іх уплыў на развіццё калектыву, вылучае новыя напрамкі дзейнасці аркестра ў эфірнай і пазаэфірнай музычнай прасторы.*

***Ключавыя словы:** сімфанічны аркестр, Беларускае радыё, музычнае вяшчанне, дырыжоры, кампазітары, музычныя праекты.*

*U. Trapianok*

## Activity of the Belteleradiocompany Symphony Orchestra: history and the present

*The article is devoted to the research of historical and modern activities of the Belteleradiocompany Symphony Orchestra. The author defines of the date of orchestra occurrence, reveals the peculiarities of the activities on the air and on the Belarusian musical life in the 21th century.*

*Analyzing the work of the orchestra in the XXI century, the author provides chronological information about the activities of the conductors, explores the impact of their work on the orchestra progress and new collective areas in the broadcasting and other activities.*

***Key words:** symphony orchestra, Belarusian radio, music broadcasting, conductors, composers, musical projects.*

Сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі, абраны ў якасці аб'екта даследавання, з'яўляецца калектывам, першаснай задачай якога была і застаецца арганізацыя музычнай часткі эфіру. На афіцыйным сайце медыяхолдынга адзначана, што гісторыя аркестра пачалася ў 1958 г.[1]

[1] Симфонический оркестр [Электронный ресурс] // Белтелерадиокомпания. – Режим доступа: https://www.tvr.by/company/uslugi/muzykalnye-kollektivy9160/simfonicheskiy-orkestr/. – Дата доступа: 27.04.2022.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак гэты факт патрабуе глыбокага даследавання, паколькі вяшчанне Беларускага радыё, якое пачалося ў лістападзе 1925 г., амаль з першых дзён будавалася на шматлікіх музычных перадачах, трансляцыях, вялася праца па стварэнні фондавых матэрыялаў. Для ажыццяўлення *мэты артыкула* – вызначэння асаблівасцей функцыянавання сімфанічнага аркестра ад моманту стварэння да нашых дзён, былі пастаўлены *задачы* па даследаванні гісторыі калектыву і яго сучасных напрамкаў дзейнасці, выяўленні ўплыву дырыжораў на развіццё аркестра, удакладненні даты з'яўлення аркестра. Пошук адказаў на гэтыя пытанні вызначае актуальнасць артыкула, паколькі раней праца выбранага музычнага калектыву ў шырокім часавым дыяпазоне не разглядалася. Прадметам даследавання вызначана спецыфіка дзейнасці сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі.

Беларускае радыё з першых гадоў вяшчання (1920-я гг.) садзейнічала эстэтычнаму выхаванню слухацкай аўдыторыі. Насельніцтва, якое ў той час у большасці было непісьменным, дзякуючы радыё мела магчымасць пазнаёміцца з творамі маладой айчыннай літаратуры, а таксама ўзорамі музычнага мастацтва. Я. Радкевіч адзначаў, што ў 1928 г. на радыё быў створаны першы ў рэспубліцы сімфанічны аркестр. Гэта дазволіла павялічыць хронаметраж мастацкіх і музычных перадач, зрабіць іх больш разнастайнымі [9, с. 26]. Калектыў называўся сімфанічны аркестр Белрадыёцэнтра (іншая назва – сімфанічны аркестр Белрадыёкамітэта).

Амаль два гады музыканты збіраліся ў прамым эфіры на выкананне разавых праграм. З 1930 г. аркестр быў пераведзены на пастаянную працу, яго ўдзельнікі сталі штатнымі супрацоўнікамі радыё. Найперш калектыў папулярызаваў беларускае музычнае мастацтва – гучалі творы кампазітараў М. Аладава, В. Залатарова, Р. Пукста, А. Туранкова, А. Багатырова, М. Чуркіна, П. Падкавырава, Я. Цікоцкага і інш.

Аркестр радыё выйшаў за межы студыйных умоў, калі ў 1934 г. на базе мінскага Клуба харчавікоў па вуліцы Інтэрнацыянальнай пачаў дзейнічаць радыётэатр, які найперш прапаноўваў выкананне музычных твораў. Аркестранты ігралі шэдэўры сусветнай музычнай культуры. Як пісаў І. Куркоў, «Клуб харчавікоў наведвалі не толькі савецкія артысты. Многія еўрапейскія знакамітасці, якія прыязджалі ў Мінск, выступалі тут» [6, с. 10]. Радыётэатр працаваў як звычайная канцэртная зала ці музычны тэатр, праграмы трансліраваліся ў прамым радыёэфіры. Дырыжорамі сімфанічнага аркестра Белрадыёцэнтра былі А. Бяссмертны, І. Гітгарц, М. Міхайлаў [8].

Сімфанічны аркестр радыёцэнтра ўдзельнічаў у падрыхтоўцы літаратурна-мастацкіх перадач, у якіх праз сінтэтычнае спалучэнне слова, музыкі, шумоў, фону адбывалася станаўленне мастацкага вяшчання і наогул нацыянальнага радыёмастацтва. Праіснаваў сімфанічны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аркестр Белрадыёцэнтра да 1937 г., пасля ўвайшоў у склад Беларускай філармоніі.

З сімфанічнага аркестра, які забяспечваў музычную аснову мастацкага вяшчання Беларускага радыё ў 1920–1930-я гг., паступова вылучыліся невялікія ансамблі, сярод якіх смычковы квартэт, вакальны квартэт, а таксама ансамбль народных інструментаў [9, с. 58].

Аналізуючы праграму перадач Беларускага радыё ад 21 красавіка 1939 г., дзе ў вячэрнім эфіры быў пазначаны канцэрт беларускай музыкі ў выкананні аркестра народных інструментаў пад кіраўніцтвам Р. Самохіна [9, с. 47–48], можам зрабіць выснову, што ансамбль народных інструментаў пераўтварылі ў аркестр народных інструментаў радыёкамітэта. Новы калектыў пераняў функцыі папярэдніка ў творча-вытворчым радыёпрацэсе. Гэты факт патрабуе больш дэталёвага вывучэння, але дае падставы сцвярджаць, што на Беларускім радыё ў канцы 1920-х – 1930-я гг. былі сканцэнтраваны лепшыя музычныя сілы краіны, якія садзейнічалі развіццю не толькі радыёвяшчання, але і музычнага мастацтва Беларусі.

Аналіз гісторыі сімфанічнага калектыву Белрадыёцэнтра патрабуе наступнага ўдакладнення. У «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі» зафіксавана, што Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР быў арганізаваны пры Беларускім радыёцэнтры паводле пастановы Цэнтральнага прафсаюза работнікаў мастацтваў Беларусі ад 19 красавіка 1927 г. на аснове аркестраў Беларускага музычнага тэхнікума і БДТ-1 [5, с. 311]. З гэтага вынікае, што сімфанічны аркестр, які дзейнічаў на радыё, стаў папярэднікам сённяшняга Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь і, адпаведна, гісторыя сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі бярэ пачатак у 1927 г.

У гады Вялікай Айчыннай вайны музычныя калектывы, занятыя ў радыёвытворчасці і пазаэфірнай дзейнасці, прыпынілі работу, перад мікрафонам выступалі ў асноўным запрошаныя артысты, зрэдку ладзіліся трансляцыі з канцэртных залаў Масквы (адтуль вялося вяшчанне Беларускага радыё).

Аднаўленне дзейнасці радыёстанцыі ў Мінску адбылося 22 верасня 1944 г. Згодна з пастановай Усебеларускага камітэта па радыёфікацыі і радыёвяшчанні пры Савеце Народных Камісараў БССР «быў створаны хор, затым секстэт домр і сімфанічны аркестр. На радыё запрашаліся вядомыя музыканты рэспублікі» [9, с. 90]. Такім чынам, была прадпрынята другая спроба забяспечыць паўнавартаснае музычнае вяшчанне. Сімфанічны аркестр удзельнічаў у стварэнні перадач, радыёспектакляў, кампазіцый і інш. Напрыклад, у 1957 г. музычнае суправаджэнне радыёпастаноўкі «Пунсовыя ветразі» па аповесці-феерыі А. Грына ажыццявілі аркестр пад кіраўніцтвам Б. Куніна і хор Беларускага радыё.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У красавіку 1958 г. быў створаны Канцэртна-эстрадны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё, які рыхтаваў канцэрты эстраднай музыкі, удзельнічаў у радыёспектаклях, радыёкампазіцыях, музычных перадачах. Першым дырыжорам калектыву на працягу двух месяцаў быў выхаванец Маскоўскай кансерваторыі С. Ратнер.

Пасля кіраўніком аркестра стаў кампазітар, дырыжор і піяніст Ю. Бяльзацкі, які кіраваў калектывам тры гады. За гэты час сфарміраваўся склад выканаўцаў, з'явіліся салісты-спевакі, сярод якіх В. Фурс, К. Ясінская, Ю. Смірноў. У рэпертуар былі ўключаны песні айчынных кампазітараў, эстрадныя п'есы, фантазіі на тэмы савецкіх кампазітараў, а таксама джазавыя творы. Для папулярызацыі айчыннай «лёгкай» музыкі аркестр выступаў у раённых цэнтрах і калгасах.

З 1961 г. аркестр узначаліў дырыжор Б. Райскі, які да гэтага некалькі гадоў працаваў з аркестрам Беларускага цырка. З прыходам Барыса Іпалітавіча акцэнт у дзейнасці калектыву быў звернуты на паляпшэнне якасці гучання. «У надзвычай кароткі тэрмін ён дамогся бездакорнай чысціні інтанацыі, гукавой раўнавагі між асобнымі групамі аркестра, тэхнічнай дасканаласці выканання», – адзначалася ў артыкуле, прысвечаным дзейнасці Б. Райскага («Літаратура і мастацтва», 1 сакавіка 1966 г.) [1, с. 42].

Павышэнне майстэрства калектыву, якога дабіваўся Б. Райскі, ацанілі па-за межамі рэспублікі. У 1966 г. аркестр браў удзел у фестывалі беларускага мастацтва і культуры ў Сібіры і на Урале [3, с. 18]. Як адзначаў С. Друкт, пасля творчай паездкі ў калектыве з'явіўся новы кірунак творчай дзейнасці – засваенне так званай сур'ёзнай музыкі. Аднак гэта, на нашу думку, быў зварот да ранейшай працы, з якой у 1927 г. пачыналася гісторыя сімфанічнага аркестра радыёцэнтра. Тэндэнцыя ўзмацнілася ў канцы 1960-х – першай палове 1970-х гг., у выніку чаго ў 1975 г. калектыў быў рэарганізаваны ў эстрадна-сімфанічны аркестр Дзяржаўнага камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні пры Савеце Міністраў БССР.

Разгледзім падрабязней, з якой музыкай працаваў аркестр Беларускага тэлебачання і радыё на чале з Б. Райскім. Многія гады з калектывам асацыіравалася паняцце «беларуская эстрада». Менавіта гэтым аркестрам агучаны практычна ўсе песні, якія з'явіліся ў кампазітараў рэспублікі за апошнія 25 гадоў. Аркестр запісваў для радыё- і тэлеэфіру «лёгкую» музыку шматлікіх айчынных кампазітараў, сярод якіх Я. Глебаў, Д. Смольскі, Р. Сурус, Я. Грышман, А. Шпянёў, В. Іваноў, Э. Зарыцкі і інш. Таксама выконваліся творы славутых савецкіх кампазітараў – Г. Гараняна, М. Кажлаева, Ю. Саульскага і інш.

Эстрадна-сімфанічны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё працаваў паралельна са сваім калектывам-папярэднікам – Дзяржаўным сімфанічным аркестрам БССР, які не мог задаволіць патрэбы маладо-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га пакалення беларускіх кампазітараў. Задачы па папулярызацыі імён і творчасці дэбютантаў выконваў калектыў Беларускага тэлебачання і радыё. Напрыклад, у 1979 г. упершыню быў выкананы скрыпічны канцэрт Г. Гарэлавай, кантата «Трава-мурава» Л. Шлег, сімфанічная паэма Л. Гуціна, Камерная сімфонія А. Залётнева [3, с. 10–11].

Рэпертуар складаўся са значных твораў акадэмічнай музыкі вядомых беларускіх аўтараў і нядаўніх выпускнікоў кансерваторыі (М. Аладава, А. Багатырова, К. Цесакова, А. Мдзівані, У. Алоўнікава, С. Картэса, Д. Смольскага, П. Падкавырава, Л. Абеліёвіча, Г. Вагнера, Р. Суруса, В. Войціка, У. Дарохіна, Э. Зарыцкага, Л. Захлеўнага, У. Будніка, В. Іванова, В. Помазава, У. Прохарава, У. Дамарацкага, У. Кандрусевіча і інш.), а таксама замежных кампазітараў (Л. Бетховена, П. Чайкоўскага, Ж. Бізэ, А. Вівальдзі, Г. Пёрсела, Э. Грыга, К. М. Вэбера, С. Рахманінава, Г. Тэлемана, Т. Альбіноні і інш.).

У снежні 1979 г. адбылося чарговае перайменаванне калектыву ў Сімфанічны аркестр Дзяржкамітэта БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні (Сімфанічны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё). Па значнасці ён стаў другім сімфанічным аркестрам краіны пасля калектыву-папярэдніка ў філармоніі.

Запісы опер «У пушчах Палесся» А. Багатырова, «Зорка Венера» Ю. Семянякі, балеты Я. Глебава «Выбранніца» і «Маленькі прынц» у выкананні аркестра тэлебачання і радыё пад кіраўніцтвам Б. Райскага з'яўляюцца аўдыяльнай спадчынай і сёння выкарыстоўваюцца ў музычных праектах Беларускага радыё, гучаць актуальна і свежа.

Калектыў працаваў не толькі для эфіру, але і прымаў удзел у важных падзеях рэспубліканскага ўзроўню. У прыватнасці, у снежні 1981 г. выступаў на пленуме Усесаюзнай камісіі ваенна-патрыятычнай музыкі Саюза кампазітараў СССР, які праходзіў у Мінску.

Былі наладжаны цесныя творчыя сувязі з многімі салістамі. З сімфанічным аркестрам Беларускага тэлебачання і радыё супрацоўнічалі артысты нацыянальнай оперы – С. Данілюк, Т. Ніжнікава, З. Бабій, Л. Галушкіна, Л. Златава, В. Чарнабаеў, А. Саўчанка, І. Сарокін, В. Кучынскі, І. Шыкунова, У. Падгайскі, В. Скарабагатаў. Дзясяткі запісаў з аркестрам на чале з Б. Райскім зрабілі эстрадныя спевакі, сярод якіх В. Вуячыч, Ю. Смірноў, Т. Раеўская, В. Пархоменка, Я. Еўдакімаў, Г. Радзько, Э. Міцуль, Э. Хіль і інш.

Дырыжор Б. Райскі ўзначальваў аркестр Беларускага тэлебачання і радыё да 1988 г. Як пісаў У. Арлоў, за гэты час калектывам былі выкананы ўсе без выключэння творы беларускай музычнай культуры [1].

З 1989 г. эстрадна-сімфанічны аркестр узначаліў заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны В. Лявонаў. У фондах Беларускага радыё ўтрымліваюцца запісы, зробленыя аркестрам пад яго кіраўніцтвам, у прыватнасці опер-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны вечар, у якім удзельнічала спявачка М. Гулегіна, творы Г. Гарэлавай, В. Кузняцова, У. Дарохіна, А. Навахроста, Г. Вагнера, Я. Глебава, Р. Суруса, Д. Смольскага, У. Дашкевіча, В. Войціка, С. Бельцюкова, П. Чайкоўскага, Д. Шастаковіча, А. Дворжака, І. С. Баха, Ф. Шапэна і інш.

Мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам сімфанічнага аркестра Беларускага тэлебачання і радыё з 1993 г. (з 1994 г. – сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі) стаў А. Лапуноў. Калектыў на чале з Анатолем Максімавічам быў задзейнічаны ў стварэнні фондавых запісаў і музыкі розных формаў і жанраў для музычных перадач. Сярод найбольш значных запісаў прыгадаем оперы «Агатка, ці Прыезд пана» Я. Д. Голанда, «Фаўст» А. Радзівіла. Сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам А. Лапунова выканаў сімфоніі А. Клеванца і Д. Смольскага, музыку Л. Абеліёвіча і К. Цесакова. Запісы склалі анталогію твораў беларускіх кампазітараў, за якую дырыжор удастоены звання «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь» [7].

Новы этап, які ўмоўна можна назваць часам нестабільнасці, прыпаў на пачатак XXI ст. Для яго характэрны частая змена мастацкіх кіраўнікоў, што, безумоўна, адбілася на колькасці агучанага і запісанага матэрыялу і якасці гучання калектыву, праца ва ўмовах пошуку камерцыйнага прыбытку, а таксама невысокая запатрабаванасць калектыву ў вытворчым працэсе, нягледзячы на з'яўленне ў 2002 г. спецыялізаванага радыёканала «Культура», закліканага захоўваць і прымнажаць нематэрыяльныя здабыткі нацыянальнай культуры ў аўдыяльным фармаце. Адной з прычын змяншэння колькасці запісаў стала мадэрнізацыя студый гуказапісу, у якіх працаваў аркестр.

У 2003–2005 гг. галоўным дырыжорам сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі працаваў А. Лясун. За гэты час невялікая колькасць арыгінальнага музычнага матэрыялу папоўніла фонды радыё. Напрыклад, аркестр запісаў выбраныя творы В. Кузняцова, М. Васючкова, А. Хадоскі.

За гады працы з аркестрам галоўнага дырыжора А. Разумава ў 2005–2007 гг. у аўдыяльны архіў радыё ўвайшлі, у прыватнасці, такія запісы, як аўтарскі вечар кампазітара С. Бельцюкова, канцэрт да 75-годдзя Беларускага саюза кампазітараў, запіс трансляцыі фестывалю «Мінская вясна-2007», якія суправаджаў калектыў Белтэлерадыёкампаніі. Супрацоўніцтва А. Разумава ў якасці дырыжора аркестра працягвалася да 2011 г.

На нашу думку, на адраджэнне калектыву, падтрыманне яго прафесійнага выканальніцкага майстэрства, наладжванне міжнародных кантактаў у пачатку XXI ст. было скіравана запрашэнне іншых дырыжораў. Славуты дырыжор Г. Праватораў кіраваў сімфанічным аркестрам Белтэлерадыёкампаніі з 2007 г. да 2009 г., аднак гэты час не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

быў перыядам творчага росквіту. Здабыткамі для нацыянальнай культуры сталі больш раннія запісы, ажыццёўленыя аркестрам Беларускага тэлебачання і радыё, іншымі калектывамі Беларусі і СССР на чале з Г. Праваторавым.

Галоўным запрошаным дырыжорам і мастацкім кіраўніком сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі ў 2009–2011 гг. стаў польскі дырыжор і кампазітар Ч. Грабоўскі. Аркестрам пад яго кіраўніцтвам ажыццёўлены запісы твораў К. Шыманоўскага, М. Карловіча, С. Манюшкі, Ф. Шапэна, Г. Вяняўскага, П. Чайкоўскага, С. Рахманінава. Актыўна ажыццяўлялася супрацоўніцтва з замежнымі дырыжорамі, у прыватнасці, Э. Пехкам (Эстонія), В. Урупіным (Расія), С. Камарцінам (Швейцарыя), Х. Эстрадам (Венесуэла), былі наладжаны выезды аркестра ў заходнія краіны. У якасці асістэнтаў Ч. Грабоўскага працавалі беларускія маладыя дырыжоры Ю. Караваеў і У. Авадок.

Такім чынам, у першае дзесяцігоддзе XXI ст. колькасць запісаў аркестра, якія папоўнілі фонды Беларускага радыё, значна паменшылася. Гэта, на наш погляд, было звязана не столькі з тэхналагічным перааснашчэннем, колькі з недакладна вызначанымі кірункамі працы, нестабільнасцю ў творчасці, пошукам новых формаў запатрабаванасці калектыву.

Дзейнасць аркестра Белтэлерадыёкампаніі ў 2012–2016 гг. працягвалася пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора В. Сарокі, які ў гады кіраўніцтва Б. Райскага быў скрыпачом калектыву. У гэты час музыканты былі задзейнічаны ў падрыхтоўцы праекта радыёканала «Культура» «Канцэртная зала», што вымагала асаблівай канцэнтрацыі выканальніцкіх здольнасцей, адчування спецыфікі працы ў прамым эфіры. Напрыклад, 1 кастрычніка 2012 г. адбылася прамая трансляцыя канцэрта з Вялікай студыі Дома радыё, прымеркаваная да 75-годдзя беларускага кампазітара Д. Смольскага. Але такі кірунак дзейнасці аркестра нельга назваць новым, паколькі так музыканты працавалі ў эфіры ў 1920–1940-я гг.

Сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі далучыўся да стварэння музычнага афармлення радыёспектакляў, як гэта адбывалася ў XX ст. Так, калектыў пад кіраўніцтвам дырыжора Ю. Караваева выконваў музыку кампазітара У. Саўчыка, спецыяльна напісаную для драматычнай пастаноўкі «Млечны шлях» (рэжысёр – А. Вінярскі, 2014) па аднайменным рамане К. Чорнага ў інсцэніроўцы П. Васючэнкі. Галоўны дырыжор В. Сарока кіраваў калектывам падчас стварэння музычнай часткі да радыёспектакля «…І няма шляху чужога» па п’есе У. Саламахі (рэжысёр – А. Вінярскі, 2015). Па прычыне скарачэння колькасці арыгінальных радыёспектакляў у параўнанні з іх выпускам у XX ст. гэты напрамак працы аркестра не вызначаўся маштабнасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам аркестра Белтэлерадыёкампаніі ў 2016–2017 гг. быў В. Чарнуха-Воліч. Аркестр працягваў дзейнасць ва ўмовах невялікай занятасці ў падрыхтоўцы эфіру і запісаў, выступленняў па-за межамі радыёстудый. Цікавым эфірным праектам В. Чарнухі-Воліча і аркестра стала акампанаванне хакейнаму матчу, што выходзіў на тэлеканале «Беларусь 5» [2]. Упершыню за гады існавання калектыву Белтэлерадыёкампаніі музыканты суправаджалі спартыўную трансляцыю мелодыямі Д. Вердзі, П. Чайкоўскага, І. Штрауса, а таксама творамі беларускіх кампазітараў Д. Смольскага, У. Солтана, Я. Глебава.

На працягу 2017–2021 гг. галоўным дырыжорам і мастацкім кіраўніком сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі быў А. Сасноўскі. За гэты час адбыліся ўкамплектаванне калектыву і змены ў складзе музыкантаў. Аркестр паступова вяртаўся да актыўнай эфірнай і пазаэфірнай працы. Своеасаблівым дэвізам творчай дзейнасці дырыжора можна назваць яго стаўленне да сімфанічных аркестраў радыё і тэлебачання з усёй Еўропы як да галоўных аркестраў краін. Па яго словах, «гэта калектывы ультракласа і з грандыёзнай дзяржаўнай падтрымкай» [4]. Аркестр Белтэлерадыёкампаніі пачаў актыўна выступаць у радыё- і тэлеэфіры з тэматычнымі праграмамі, святочнымі канцэртамі, прэм’ерамі твораў айчынных кампазітараў. У прыватнасці, за апошнія гады калектыў прымаў удзел у стварэнні праграм да 95-годдзя Беларускага радыё, якое адзначалася ў лістападзе 2020 г., навагодніх канцэртах на тэлеканале «Беларусь 3», ажыццяўленні прэм’ернага выканання твораў А. Літвіноўскага для канала «Культура», многія праекты папоўнілі фонды Белтэлерадыёкампаніі. Адзначым, што ў 2018–2019 гг. з аркестрам таксама працаваў дырыжор А. Галанаў.

Працягвалася практыка супрацы з замежнымі дырыжорамі, укаранёная ў першым дзесяцігоддзі XXI ст. За дырыжорскі пульт аркестра Белтэлерадыёкампаніі з 2012 г. па 2019 г. станавіўся нямецкі дырыжор В. Кайтэль. Ён быў ініцыятарам міжнародных праектаў. Напрыклад, у 2013 г. сімфанічны аркестр і акадэмічны хор Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам В. Кайтэля выступалі ў Стамбуле. Дырыжор у 2018 г. прапанаваў супрацоўніцтва з аркестрам гурту Rammstein, які запісваў у Мінску новы альбом[1].

Яркімі прыкладамі арганізацыі сумесных праектаў, здольных прыцягнуць увагу да творчасці аркестра прыхільнікаў розных музычных жанраў, сталі праект аркестра Белтэлерадыёкампаніі 2019 г. з японскім дырыжорам К. Шымура па выкананні музыкі з анімэ (мелодый з сус-

[1] Fast Geschafft [Электронны рэсурс] // Rammstein. – Рэжым доступу: https://www.rammstein.de/de/fast-geschafft/. – Дата доступу: 05.04.2022.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ветна вядомых фэнтэзі і камп'ютарных гульняў), праграма «Музыка камп'ютарных гульняў» (2021, дырыжор – А. Якушаў).

Сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі з 2021 г. працягвае дзейнасць пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора А. Высоцкага. Калектыў актыўна працуе над стварэннем эфірных праектаў тэлеканала «Беларусь 3», радыёканала «Культура», Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё. Напрыклад, на 2022 г. у планах аркестра для радыёэфіру значыліся запісы праектаў, прысвечаных сустрэчы Новага года, Дню жанчын, Міжнароднаму дню тэатра, Дню Перамогі, а таксама тэматычныя музычныя праграмы, складзеныя з мелодый кіно, тэатра, балетнай музыкі беларускіх кампазітараў, старадаўняй музыкі С. Манюшкі, Я. Д. Голанда. Выбраныя праграмы рыхтуюцца выключна для тэлевізійнай або радыётрансляцыі, што сведчыць пра выкананне галоўнай задачы калектыву – арганізацыю музычнага эфіру.

Падсумоўваючы, адзначым, што ў 2022 г. споўнілася 95 гадоў з моманту стварэння сімфанічнага аркестра для працы ў беларускім радыё- і тэлеэфіры. З 1937 г. да 1944 г. у дзейнасці аркестра адзначаўся вымушаны перапынак, звязаны з перадачай калектыву на баланс Белдзяржфілармоніі, а таксама падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Затым калектыў аднавіў працу па падрыхтоўцы музычнага матэрыялу для перадач, радыёспектакляў, удзельнічаў у фарміраванні аўдыяльных і аўдыявізуальных фондаў Белтэлерадыёкампаніі.

У ХХ ст. аркестр, найменне якога неаднаразова змянялася, актыўна прапагандаваў нацыянальную акадэмічную і эстрадную музыку, выконваў узоры сусветнай класікі і сучаснага музычнага мастацтва ў радыё- і тэлевізійным эфіры, на пляцоўках, здольных змясціць музыкантаў. Перыяд плённай працы калектыву звязаны з імем дырыжора Б. Райскага.

Скарачэннем аб'ёму эфірнай запатрабаванасці, засваеннем новых кірункаў дзейнасці, такіх як супраца з запрошанымі беларускімі і замежнымі дырыжорамі і музыкантамі, стварэнне эксперыментальных, у тым ліку міжнародных, праграм па сумяшчэнні сімфанічнага гучання з жанрамі папулярнай музыкі, вызначылася дзейнасць аркестра Белтэлерадыёкампаніі ў пачатку ХХІ ст.

У нашы дні калектыў дастаткова заняты ў падрыхтоўцы музычных радыё-, тэлеперадач і канцэртаў, удзельнічае ў рэалізацыі сумесных музычных праектаў з калектывамі і асобнымі творцамі Беларусі і свету, што сведчыць аб прафесійным узроўні аркестра і адкрывае перад ім новыя перспектывы.

1. *Арлоў, У. А.* Барыс Райскі / У. А. Арлоў. – Мінск : Харвест, 2016. – 64 с.

2. В день своего 60-летия симфонический оркестр Белтелерадиокомпании выступит в неожиданном амплуа [Электронный ресурс] // СБ-Беларусь сегодня. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/taper-na-chas-legenda-na-veka.html. – Дата доступа: 05.04.2022.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Друкт, А. А.* Сімфанічны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё / А. А. Друкт. – Мінск : Полымя, 1984. – 32 с.

4. Дырыжор Аляксандр Сасноўскі. Кадры жыцця [Электронны рэсурс] // Беларусь 3. – Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=RZsI9QnaoU8. – Дата доступу: 21.03.2022.

5. *Капілаў, А. Л.* Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр БССР / А. Л. Капілаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск : БелСЭ, 1984–1987. – Т. 2: Габой – Карціна / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – 1985 . – С. 311–312.

6. *Курков, И. Н.* Белтелерадиокомпания. Мир живого эфира / И. Н. Курков. – Минск : Медиафакт, 2007. – 304 с.

7. Лапунов Анатолий (дирижер) [Электронный ресурс] // Белгосфилармония. – Режим доступа: https://philharmonic.by/ru/artists/lapunov-anatoliy-dirizher. – Дата доступа: 21.03.2022.

8. *Мазанік, В. У.* Сімфанічны аркестр Белрадыёцэнтра / В. У. Мазанік // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск : БелЭн, 1994–2004. – Т. 14: Рэле – Слаявіна / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – 2002. – С. 390.

9. *Радкевіч, Я. Р.* Беларускае радыё: гісторыя, перспектывы развіцця / Я. Р. Радкевіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1983. – 197 с.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 06.05.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ